насцю адрамантаваў храм звонку; яго намаганнямі зарослая старымі дрэвамі і хмызняком прыкасцельная тэрыторыя, якую ад дарогі аддзяляла напаўразбураная каменная агароджа, стала светлай, дагледжанай, акуратнай. Поўнасцю адноўлена агароджа, вакол касцёла з'явілася бетонная дарожка, па якой у святочныя дні ідзе працэсія. Адрамантавана плябанія і добраўпарадкавана тэрыторыя вакол яе. Праведзены рамонтныя работы ўнутры храма.

Мураваны касцёл Узвышэння Святога Крыжа ў вёсцы Быстрыца з'яўляецца адным з каштоўных помнікаў позняга беларускага барока, названага віленскім.

ЛІТАРАТУРА


1. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004. – 472 с.
2. Каталіцкія храмы на Беларусі. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2000. – С. 20.
3. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com_content&task=view&id=111&Itemid=38.
4. Быстрыца і яе жыхары [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.ostrovets.by/?p=2160.


**УДК 72.05:296.735(476.6)**

## ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ АСТРАВЕЦКАГА РАЁНА САНКТУАРЫЙ МАЦІ БОЖАЙ ШКАПЛЕРНАЙ У ГУДАГАІ

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)***

*Даследуецца санктуарый Маці Божай шкаплернай у Гудагаі – гісторыка-культурная каштоўнасць Астравецкага раёна. Гісторыя гудагайскай парафіі цесна звязана з абразом Маці Божай. Архітэктанічна і прапарцыянальна Гудагайскі касцёл імітуе ў дрэве формы мураваных каталіцкіх святынь позняга барока.*

На зямлі ёсць шмат месцаў, пазначаных прысутнасцю Бога, у якіх вернікі атрымліваюць шматлікія ласкі. Часам гэта незвычайнай прыгажосці катэдры і базылікі, часам – простыя драўляныя і маленькія святыні. Сярод святыняў, рассеяных па свеце, асаблівую ролю адыгрываюць марыйныя санктуарыі – месцы, звязаныя з аб'яўленнямі Маці Божай, цудоўным з'яўленнем Яе выяваў або іншымі падзеямі, якія прываблiваюць шматлікіх вернікаў. На Беларусі таксама даволі шмат месцаў, дзе Бог здзяйсняе вялікія справы праз пасрэдніцтва сваёй Маці. Сярод многіх абразоў Найсвяцейшай Маці важную ролю адыгрывае абраз Маці Божай Гудагайскай, звязаны са шкаплерным набажэнствам. Гэты абраз быў ўрачыста ўпрыгожаны папскімі каронамі 15 ліпеня 2007 года. Акт каранацыі цудоўнага абраза стаў чарговай важнай рэлігійнай падзеяй у жыцці Гродзенскай дыяцэзіі і ўсяго Касцёла на Беларусі [1].

Мястэчка Гудагай – цяпер невялікая вёска ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці, на трасе Ашмяны – Астравец, недалёка ад чыгуначнай лініі Калінінград – Вільнюс – Мінск – Масква. Маляўнічыя ваколіцы – лес, узгоркі і шырока распасцёртыя стужкі-хвалі сельскагаспадарчых палёў надаюць гэтаму месцу асаблівае хараство. На ўскрайку вёскі стаіць маленькі драўляны касцёл, збудаваны на невялікім узгорку, адкуль пры добрай бачнасці відаць суседнія вёскі і горад Астравец.

Акрамя мураваных культавых збудаванняў на Астравеччыне ацалела некалькі каштоўных помнікаў драўлянага сакральнага дойлідства, з якіх найбольш старажытным з'яўляецца **касцёл Наведвання Божай Маці ў в. Гудагай** [2]. Касцёл фундаваны ў 1764 годзе абозным полацкім Юзафам Крыштофам Войнам з жонкай Ганнай Людвікай з Суліструўскіх пры кляштары кармелітаў босых. Архітэктанічна і прапарцыянальна Гудагайскі касцёл імітуе ў дрэве формы мураваных каталіцкіх святынь позняга барока. Выцягнуты прамавугольны аб'ём і роўная з ім пяціграння апсіда прэсбітэрыя аб'яднаны двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром і застрэшкамі ў месцы злучэння зрубаў. Па баках прэсбітэрыя размешчаны невысокія квадратныя ў плане сакрысціі. Галоўны фасад па вуглах асноўнага аб'ёма фланкіруюць 2 чацверыковыя вежы, якія раней завяршаліся яшчэ адным ярусам чацверыкоў з фігурнымі барочнымі купалкамі. Пасля рэканструкцыі галоўны фасад завершаны класіцыстычным трохвугольным франтонам з гарызантальнай ашалёўкай і вастраверхай сігнатуркай. У касцёле ёсць унутраны нартэкс, над якім на 2 слупах размешчаны вялікія арганныя хоры, і экзанартэкс – невысокі вонкавы прытвор-бабінец.

Паводле фотаздымка Яна Балзункевіча пачатку XX стагоддзя прытвор меў аднасхільны дашак (мал. 1). Пазней уваходны аб'ём атрымаў двухсхільны дах з трохвугольным франтонам, схілы якога адпавядаюць

асноўнаму франтону, што стварае новы згарманізаваны і ўраўнаважаны вобраз святыні. Першапачатковую барочную стылістыку нагадваюць лучковыя абрысы вокнаў і вертыкальная ашалёўка будынка. Уваходныя дзверы аздоблены дэкаратыўнай ашалёўкай. На франтоне прытвора сіметрычныя фігурныя люнеты. Прасторны інтэр’ер касцёла перакрыты плоскай падшыўной столлю. Сцены ашаляваны гарызантальна з вертыкальнай панеллю ўнізе. Тры прысценныя архітэктурныя алтары і арган выкананы ў стылі барочнага класіцызму, белыя з пазалотай, з элементамі ракайльнай аздобы. Двух’ярусныя бакавыя алтары св. Казіміра і Сэрца Езуса пастаўлены пад вуглом да сцен асноўнага аб’ёма, што надае інтэр’еру барочную дынаміку, стварае перацяканне прасторы. У цэнтры трох’яруснага галоўнага алтара мясцовы цудадзейны абраз Маці Божай Шкаплернай, апякункі кармелітаў.



Мал. 1. Касцёл Наведвання Божай Маці ў в. Гудагай. Здымак пач. XX ст.

Гісторыя гудагайскай парафіі цесна звязана з абразом Маці Божай. У адной з легендаў гаворыцца, што ў мясцовых ваколіцах у старажытнай ашмянскай пушчы жыў пустэльнік, які ў аддаленасці ад людзей паглыбляўся ў малітву і практыкі пакаяння, а таксама даваў парады і аказваў духоўную дапамогу людзям, якія да яго ахвотна прыходзілі. Непадалёку праходзіў шлях, што яднаў Захад і Усход. У той час ездзілі па ім шматлікія купцы, якіх вельмі часта рабавалі злодзеі. Аднойчы на купецкі караван напалі рабаўнікі, а ў месцы, дзе гэта адбылося, засталося шмат каштоўных рэчаў. Сярод іх магла быць і ікона Маці Божай, якую потым прынеслі пустэльніку, а ён змясціў яе ў сваім доме. Іншая легенда апавядае, што непадалёку ад Бернасішак, на хутары Паляны (мясцовасць захавалася да сённяшняга дня), стаяла леснічоўка, дзе жыў вельмі пабожны ляснік, які праводзіў асаблівае набажэнства да Найсвяцейшай Маці. У яго шалашы або вартаўнічым будане і з’явіўся абраз Марыі. Паводле яшчэ адной легенды, гэты абраз быў выкінуты з дома аднаго з шляхецкіх родаў пасля прыняцця пратэстантызму або кальвінізму, а ў выніку – адмаўлення культу Маці Божай і святых. Незалежна ад праўдзівасці версій, відавочна адно: сам Бог выбраў гэта месца, як і шмат іншых, каб удзяляць свае ласкі. Прамавугольны абраз Маці Божай, памерам 31,2 × 27,7 см, пакрыты прыгожаю шатаю, з’яўляецца копіяй іконы Маці Божай Уладзімірскай, якую хутка пачало ўшаноўваць мясцовае насельніцтва. Да будана ў гаі пачалі прыходзіць людзі, каб папрасіць дапамогі ў Найсвяцейшай Маці, прысутнай у абразе, і іх просьбы былі выслуханыя.

У свядомасці людзей назва мясцовасці таксама звязана з абразом: найперш яна паведамляе, што цудоўны абраз знаходзіўся ў будане ў гаі, таму гэта месца называлі Будагае, аж пакуль не ўзнікла сучасная назва Гудагай. (Этымалогію назвы Гудагай можна таксама вывесці з літоўскага слова Gudija – Беларусь) [3].

Першыя гістарычныя дадзеныя пра абраз Маці Божай Гудагайскай мы знаходзім у акце фундацыі кляштара кармэлітаў босых у Гудагаі, які датаваны 19 студзеня 1764 года. З яго даведваемся, што абраз Маці Божай Гудагайскай, які славіўся «цудамі ўжо сто гадоў», 25 верасня 1735 года купіла разам з нерухомасцю Гудагай у рода Развадоўскіх Людвіка Ганна з Сулістроўскіх (Козел-Паклеўская па першым мужы) Война (жонка дзісненскага старасты). Праз год новая гаспадыня Гудагая пабудавала для абраза капліцу замест старой, спаленай шведамі ў 1656 годзе. Ганна Война з Сулістроўскіх хацела такім чынам выпрасіць вечнае збаўленне для свайго першага мужа Міхала Козел-Паклеўскага, які трагічна загінуў падчас нападу разбойнікаў, калі вяртаўся з Варшаўскага сейма. Памерлы адышоў з гэтага свету без святых сакрамэнтаў і, апроч таго, у сне турбаваў сваю жонку, таму яна хацела, каб вернікі маліліся падчас набажэнстваў аб вечным супакоі для яе мужа.

У 1763 годзе Войны пабудавалі ў Гудагаі касцёл, а праз год з левага боку за касцёльным пляцам (касцёльнымі могілкамі) – двух’ярусны кляштар кармэлітаў босых Літоўскай правінцыі св. Казіміра, якіх

перавялі з Вільні, з Вострай Брамы, каб апекавацца цудоўным абразом. Пасля таго як кармэліты прыбылі ў Гудагай, 8 верасня 1764 года, у свята Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі, яны ўрачыста перанеслі абраз у касцёл і змясцілі яго ў галоўным алтары. Кляштарны летапісец занатаваў, што «ўвесь Гудагай набыў урачысты выгляд, там былі ўзведзены і прыгожа аздоблены брамы на месцах прамоваў. Увесь шлях ад уваходу да касцёла на некалькі метраў быў высланы дыванамі і кветкамі... Меладычная музыка злівалася з боем касцёльных званоў». З самага пачатку сваёй прысутнасці ў Гудагаі кармэліты пашыралі культ Маці Божай, асабліва развіваючы шкаплернае набажэнства і беручы пад душпастырскую апеку мясцовае насельніцтва. 21 верасня 1777 года Віленскі біскуп Ігнацы Якуб Масальскі заснаваў гудагайскую парафію, у якой налічвалася каля 1500 вернікаў. Пры парафіі кармэліты арганізавалі школу для сіротаў і шпіталь, або інакш прытулак для бедных. На жаль, дзейнасць парафіі была перарваная пасля падаўлення лістападаўскага паўстання. З 1832 года дэкрэтам цара Мікалая І быў ліквідаваны таксама кляштар у Гудагаі, а яго маёмасць перададзена дзяржаве. Парафію падзялілі і далучылі да суседніх парафій, а касцёл, званіцу і іншыя пабудовы прадалі габрэям пад знос. Цудадзейны абраз Маці Божай Гудагайскай знайшоў сховань у касцёле ў Ашмянах, куды яго разам з вотамі ва ўрачыстай працэсіі занеслі адданыя шанавальнікі. Разам з абразом, як яго апякун, накіраваўся туды апошні гудагайскі настаяцель айцец Урбан Кляпацкі, які стаў у ашмянскай парафіі вікарыем, захоўваючы права насіць кармэліцкі габіт.

Вернікі не маглі пагадзіцца са стратаю любімай святыні і месца культу. На шчасце, габрэі не разабралі касцёла і званіцы. У 1856 годзе гудагайскі касцёл набыў, а потым аднавіў кс. Данат Сямашка. У 1878 годзе ад уладаў атрымалі дазвол праводзіць у Гудагаі ў кожную суботу св. Імшу, а з часам часцей цэлебраваць літургію ў большыя касцёльныя святы. На ўрачыстасці адпусту, асабліва Маці Божай Шкаплернай і Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі (8 верасня), збіралася вялікая колькасць вернікаў. Няспынныя і настойлівыя намаганні вернікаў прычыніліся да таго, што ў 1906 годзе ўлады аднавілі гудагайскую парафію і пробашчам у ёй стаў ксёндз Фелікс Мінгін.

Касцёл чакаў ужо толькі вяртання цудоўнага абраза Маці Божай. Жаданы час вяртання адбыўся больш як сто гадоў таму, 2 жніўня 1907 годзе, у свята Маці Божай Анёльскай. Шматтысячная працэсія выйшла з Ашмянаў у Гудагай, адкуль урачыста быў перанесены абраз Маці Божай Гудагайскай на яго ранейшае месца. Па дарозе стаялі шматлікія брамы, упрыгожаныя зелянінаю і кветкамі. Людзі з вёсак, праз якія праходзіла працэсія, на каленях аддавалі пашану Марыі, радуючыся, што праз 75 гадоў Гудагай ізноў стаў месцам культу Маці Божай. Адзін з відавочцаў, які паходзіў з гудагайскай парафіі, кс. Аляксандр Ляховіч, у 1931 годзе ва ўспамінах напіша: «З вяртаннем у Гудагай цудоўнага абраза Маці Божай распачаліся... ранейшыя пілігрымкі. Хоць вялікіх групавых пілігрымак сёння тут не бывае, затое на працягу ўсяго лета амаль штодзённа прыходзяць людзі з даволі аддаленых месцаў, а асабліва гэта бачна падчас урачыстасці Маці Божай, калі лічба вернікаў часам большая за 10 тысяч».



Мал. 2. Інтэр’ер касцёла Наведвання Божай Маці ў в. Гудагай

Вялікую ролю ў аднаўленні культу Маці Божай Гудагайскай адыгралі мясцовыя пробашчы, сярод якіх трэба назваць кс. Паўла Сянкевіча, пробашча гудагайскай парафіі ў 1921–1929 гадах і з 1931 года аж да смерці 13 лютага 1959 года. Ён як руплівы душпастыр клапаціўся не толькі пра духоўнае развіццё парафіі і рэлігійнае жыццё, але аднавіў касцёльныя будынкі, пабудаваў крухту да касцёла і плябанію, а таксама ў 1938 годзе паклапаціўся пра рэстаўрацыю і кансервацыю цудоўнага абраза Маці Божай Гудагайскай, загадваючы сачыць за рэстаўрацыйнаю працаю віленскаму ваяводскаму рэстаўратару помнікаў даўніны. У 1938 годзе ў святыні быў устаноўлены арган, а праз год размаляваны інтэр’ер. Кс. Павел Сянкевіч даручыў намаляваць некалькі копій абраза. З мэтай распаўсюджвання культу было надрукавана 1000 экзэмпляраў абразоў у натуральную велічыню і некалькі тысяч меншых абразкоў, на адваротным баку якіх быў змешчаны спеў да Маці Божай Гудагайскай, які выконвалі кармэліты босыя ў XVIII стагоддзі.

У міжваенны перыяд невялікі касцёл не мог змясціць шматлікіх вернікаў, таму ў 1935 годзе кс. Павел Сянкевіч прыклаў немалыя намаганні, якія праз пяць гадоў завяршыў кс. Генрык Драгель, для пабудовы новай святыні. Быў падрыхтаваны будаўнічы праект і нават пачаўся збор матэрыялаў, але неспакойны час перашкодзіў рэалізаваць гэты праект. Ваенныя падзеі, а пасля камуністычныя часы прыпынілі развіццё парафіі і культу Маці Божай Гудагайскай, аднак руплівыя душпастыры рабілі ўсё, што было ў іх сілах, каб не даць згаснуць веры. Пасля смерці кс. Паўла Сянкевіча пробашчам стаў кс. Адам Вайцэхоўскі, адданы шанавальнік Марыі і выдатны прапаведнік, які гэтак жа, як і яго папярэднік, не паддаўся ўціску і не пабаяўся запалохвання ўладаў, а ахвярна вучыў словам і прыкладам навуцы пра Бога і Яго праўду. Фізічна і псіхічна вычарпаны, ён памёр у дзень Маці Божай Шкаплернай, 16 ліпеня 1973 года.

Парафіяне ўбачылі ў яго смерці выразны знак удзячнасці за адданую і сумленную працу, дадзены Маці Божаю. Да сённяшняга дня на магіле кс. Адама пастаянна стаяць жывыя кветкі.

На працягу 17 наступных гадоў у Гудагаі ўжо не было сталага святара, таму душпастырскую апеку ажыццяўляў астравецкі дэкан, якога вернікі называлі «патрыярхам астравецкай зямлі», – ксёндз пралат Алойзы Тамковіч. Ён пражыў 91 год і памёр 6 снежня 2001 года. Ксёндз пралат вельмі часта казаў: «Калі хто хоча прапацець, як у лазні, то павінен прыехаць на адпуст Маці Божай Шкаплернай у Гудагай» (на ўрачыстасць адпусту збіраецца вялікая колькасць людзей, і ў касцёле вельмі цесна і горача).

Вялікую ролю ў захаванні веры і абароне касцёла адыгралі кляўзуровыя дамініканкі, якія пасля ліквідацыі кляштара ў Вільні мусілі працаваць у розных парафіях, каб пераажыць час пераследу і дапамагаць святарам.

Праз 158 гадоў, 7 ліпеня 1990 года, перад цудоўным абразом Маці Божай Гудагайскай распачалося сталае парафіяльнае душпастырства і манаскае жыццё. Першым пробашчам гудагайскай парафіі пасля доўгага перапынку стаў айцец Бярнард Радзік OCD. Кармэліты зрабілі кляштар у плябаніі, якую пасля вайны мясцовыя ўлады ператварылі ў школу, а ў былой школе міжваеннага часу пасяліліся сёстры кармэліткі Дзіцятка Езус. Айцец Бярнард пры падтрымцы біскупа дыяцэзіі, а таксама парафіянаў і сваіх сабратоў, распачаў намаганні па аднаўленні культу Маці Божай Гудагайскай. 17 лістапада 1991 года айцец Бярнард і старшыня калгаса Мечыслаў Валуевіч, прымаючы ўдзел у кананізацыі кармэліта з Вільні, айца Рафала Каліноўскага, падаравалі копію абраза Маці Божай Гудагайскай, намаляваную Яе шанавальнікам Дзмітрыем Балтрушкевічам, Святому Айцу Яну Паўлу ІІ, адначасова просячы яго благаславення для парафіі і пілігрымаў.

Незабыўная падзея адбылася 15 ліпеня 2007 года – кардынал Казімір Свёнтак здзейсніў каранацыю цудадзейнай іконы [4]. Зараз кожны год 15 ліпеня адзначаецца ўрачыстасць Гудагайскай Божай Маці. Шмат вернікаў з Беларусі і суседняй Літвы прыходзяць і прыязджаюць на пярэданні свята, каб прайсці ўсім разам “крыжовы шлях”, які складае каля 5 кіламетраў, таксама стаць удзельнікамі цудоўнай начной працэсіі і імшы. І зразумела, памаліцца ў час галоўнай святочнай імшы, атрымаць падтрымку і благаслаўленне Божай Маці, якія ахінаюць душу сваёй цеплынёй і берагуць на працягу года да новай сустрэчы.



Мал. 3. Касцёл Звеставання Панне Марыі ў вёсцы Гудагай. Сучасны выгляд

Абраз Маці Божай Гудагайскай праславіўся шматлікімі цудамі: вядомы факты фізічных і духоўных аздараўленняў. Кніга просьбаў і падзякаў дапаўняецца ўсё новымі і новымі запісамі людзей, якія ў Гудагаі, у славутай Лекарскі, атрымалі чаканае суцяшэнне і ласкі. Апекуны санктуарыя, кармэліты босыя, хочуць, каб кожны, хто сустрэнецца з Маці Божаю Гудагайскаю ў абраным Ёю месцы або духоўна каля Яе абраза, мог годна пераажыць час свайго зямнога жыцця, а пасля смерці радавацца здзяйсненню абяцанняў, дадзеных умілаваным дзецям Бога і Марыі Маці.

ЛІТАРАТУРА

1. Аркадзь Куляха OCD, Абраз Маці Божай у Гудагаі. – Мінск: «Pro Christo», 2007.
2. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004. – 479 с.
3. Вікіпедыя. Гудагай [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://be-x-old.wikipedia.org/wiki/Гудагай.
4. Краско Ф., Аве, Марыя! / Ф. Краско [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com_content&task=view&id=115&Itemid=71.